Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 4. Варыянт 3**

**Білет № 4. Практычнае заданне. Развіццё навукі, адукацыі, культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.**

**Заданні склаў:**Барэйша Ілля Аляксандравіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №5 г.Жлобіна»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

Пытанні і заданні 1. Якія прыярытэты Рэспублікі Беларусь у сферы культуры?
2. Раскажыце пра які-небудзь вядомы вам культурна-гістарычны брэнд нашай краіны.
3. Канкрэтызуйце з апорай на фотаздымак выраз аб тым, што Рэспубліка Беларусь стала касмічнай дзяржавай.
4. Ахарактарызуйце, у чым заключаецца ўклад Д.В.Домрачавай у развіццё беларускага спорту.

## Крыніца I

**З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі на IV Усебеларускім народным сходзе, снежань 2010 года**

«Культура фармуе дух нацыі! Вось чаму на першы план устала задача… захавання і ўзмацнення культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства.
Неабходна працаваць над стварэннем культурна-гістарычных брэндаў, якія маглі б яскрава, пазітыўна і поўна прадставіць нашу краіну…»

## Крыніца II

**Дар'я Домрачава на XXII Зімовых Алімпійскіх Гульнях у Сочы**




## Крыніца III



**Алег Навіцкі на Міжнароднай касмічнай станцыі, красавік 2021 г.**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**Захаванне і ўзмацненне культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства, стварэнне культурна-гістарычных брэндаў, якія маглі б яскрава, пазітыўна і поўна прадставіць нашу краіну.

**2.**У спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны: Белавежская пушча (помнік прыроды), замкавы комплекс "Мір" (г.п Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці), архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у г.Нясвіжы (Мінская вобласць) і Дуга Струве (Брэсцкая і Гродзенская вобласці).

У спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны: святочны калядны абрад "Калядныя цары" ў вёсцы Семежава (Капыльскі раён, Мінская вобласць), урачыстасць у гонар шанавання абраза Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст) у г.Будслаў (Мядзельскі раён) абрад «Юр'еўскі карагод» у в. Пагост (Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці), культура ляснога бортніцтва.

Аб'ектамі культурна-гістарычнай спадчыны, якія маюць сусветнае значэнне, з'яўляюцца палацава-паркавы ансамбль (кан. XVIII – XIX ст.) у г.Гомелі, Барысаглебская (Каложская) царква (XII ст.) у г.Гродна, Аўгустоўскі канал (XIX ст.) Гродзенскім раёне, цэрквы абароннага тыпу (кан. XV – пач. XVI стст.) у в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна, цэрквы-крэпасці абароннага тыпу (XVI ст.) у в. Мураванка Шчучынскага раёна, комплекс былога кляштара езуітаў у г. Нясвіжы (XVI) XIXст.), Сафійскі сабор (1044–1066гг., 1738–1750гг.), і Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку (XII ст.), касцёл Іаана Хрысціцеля (1603–1606гг.). крэпасці (1836–1842гг., 1911–1914гг.), Траецкі касцёл са званіцай (1583г.) у аграгарадку Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна, Камянецкая вежа (XIII ст.) у г.Камянец Брэсцкай вобласці і інш.

**3.**На фотаздымку паказаны ўраджэнец г.Чэрвень Мінскай вобласці, расійскі касманаўт, член атрада касманаўтаў Навукова-даследчага выпрабавальнага цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына (ЦВК). Алег Віктаравіч Навіцкі. Адзін з трох ураджэнцаў Беларусі, якія лёталі ў космас (тройчы – Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак).

Агульны налёт (2012, 2016 і 2021 гг.) – 531 сутак і 22 гадзіны ў адкрытым космасе.

Сёння ў касмічнай галіне краіны задзейнічана больш за 20 навуковых і вытворчых арганізацый. У іх працуе каля 4 тыс. спецыялістаў. Сфарміравана буйная стратэгічная сістэма даследаванняў космасу. У Беларусі выпускаюць аптычныя сістэмы высокага дазволу для спадарожнікаў, касмічныя люстэркі, апаратуру для дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Сумесна з расіянамі беларускія спецыялісты распрацоўваюць перспектыўныя тэхналогіі.

Першыя працы над касмічным апаратам у Рэспубліцы Беларусь пачаліся ў 2003г. у супрацоўніцтве з расійскімі спецыялістамі. Праект першага спадарожніка быў беларускі, але ствараўся на расійскіх вытворчых магутнасцях. Запуск адбыўся 26 ліпеня 2006 г., але ён аказаўся няўдалым з-за ракеты-носьбіта, і апарат быў разбураны. Беларуская касмічная праграма была сфарміравана ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта 14 чэрвеня 2007г.

З запускам спадарожніка БКА 22 ліпеня 2012 года Беларусь увайшла ў лік касмічных дзяржаў. 1 лістапада 2013г. Генеральная асамблея ААН прыняла Рэспубліку Беларусь у Камітэт ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах

**4.**Дар'я Домрачава - беларуская біятланістка, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка, двухразовая чэмпіёнка свету (2012 і 2013 гг.), уладальніца Кубка свету 2014-2015 гг. уладальніца 6 малых Крыштальных глобусаў Кубка свету па біятлоне, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Самая тытулаваная спартсменка ў гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў па біятлоне, а таксама першая ў свеце біятланістка, якая атрымала тры перамогі ў асабістых гонках. У дзень заваявання трэцяга залатога медаля на Гульнях 2014г. было прысвоена званне «Герой Беларусі», яна стала першай у гісторыі краіны жанчынай,

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

ганараванай вышэйшай узнагароды Рэспублікі Беларусь (адна з чатырох Герояў Беларусі, якія цяпер жывуць).